

# ГЕОГРАФ, КРАЯЗНАЎЦА, ВЫКЛАДЧЫК

## (да 85-годдзя з дня нараджэння П.А. Лярскага)

Вядомы географ, краязнаўца Петр Аляксеевіч Лярскі нарадзіўся 2 студзеня 1918 года ў вёсцы Рымінка, што на Магілеўшчыне, у сялянскай сям'і. Скончыўшы сямігодку першым вучнем, спрабаваў паступіць на педрабфак Магілеўскага педінстытута імя І.Д. Папаніна, куды яго не ўзялі з-за маладосці. 3 верасня 1934 года ён усё ж вучыцца на рабфаку, праходзіць праграму сярэдняй адукацыі. Вучыўся вельмі добра, таму атрымліваў персанальную стыпендыю, якая была сто рублеў, замест сарака пяці.

Адметным у лёсе П.А. Лярскага стаў і наступны, 1935 год, калі ён быў залічаны студэнтам геаграфічнага факультэта Магілеўскага педінстытута. У час вучобы працаваў сакратаром на сваім факультэце, настаўнічаў на курсах абітурыентаў. Чатыры гады праляцелі хутка. Атрымаўшы дыплом з адзнакай (адзін з двух у выпуску 1939 г.), Петр Аляксеевіч едзе працаваць настаўнікам у Дзернавіцкую СШ Нараўлянскага раёна. Праз тры месяцы быў прызваны ў Савецкую Армію.

Вайну зведаў у першыя яе гадзіны. Паблізу мястэчка Негарэлае, што на Гродзеншчыне, да якога прыйшлося адступаць, вайсковая часць Пятра Аляксеевіча прыняла свой апошні бой. Цудам пазбег палону. Доўга блукаў па лясах, пакуль не патрапіў на партызанскі атрад, разам з якім удзельнічаў у многіх баявых аперацыях. 28 чэрвеня 1944 г. Асобны партызанскі полк № 13, у складзе якога быў Лярскі, уліўся ў рады Чырвонай Арміі.

Пасля вайны П.А. Лярскі некаторы час настаўнічаў у вясковай школе. У студзені 1945 года прыйшоў на геафак Магілеўскага педінстытута, якому аддаў больш як 30 гадоў. Яго кандыдацкая дысертацыя «П.І. Рычкоў як выдатны рускі географ XVIII ст» (абаронена ў 1954 г.) вярнула імя забытага вучонага, першага членакарэспандэнта Санкт-Пецярбургскай Акадэміі навук. У 1957 г. Пятру Аляксеевічу прысвойваецца званне дацэнта.

Яго заўсёды захапляла геаграфія роднай рэспублікі і, безумоўна, Магілеўшчыны. У выніку пленнай навукова-даследніцкай дзейнасці ім быў напісаны шэраг кніг і навуковых артыкулаў. Сярод іх – падручнікі для факультэтаў пачатковага навучання педінстытутаў «Геаграфія» (сумесна з М.С. Ратабыльскім; 2-е выд., 1966 г.), а таксама – «Землязнаўства і краязнаўства» (гады выдання – 1976, 1987). Апошні падручнік і сення выкарыстоўваецца для навучання будучых настаўнікаў пачатковых класаў.

П.А. Лярскі быў аўтарам падручнікаў па прыродазнаўстве для вучняў III і IV класаў. Яны шмат разоў перавыдаваліся. Да падручнікаў дадаваліся «Каляндар прыроды і працы», «Рабочы сшытак па прыродазнаўстве». Варта адзначыць, што вучэбны комплекс па прыродазнаўстве П.А. Лярскага ў 1990 г. быў адзначаны Міністэрствам адукацыі СССР як лепшы ў нацыянальных рэспубліках. Пётр Аляксеевіч – аўтар больш за 100 навуковых прац, у тым ліку 15 кніг (частка з іх

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

напісана ў сааўтарстве).

З 1977 года, пасля закрыцця геаграфічнага факультэта і кафедры геаграфіі, Пётр Аляксеевіч пераходзіць на кафедру педагогікі і методыкі пачатковага навучання педагагічнага факультэта. Ён чытае курс методыкі выкладання прыродазнаўства, вядзе практычныя і лабараторныя заняткі, кіруе педагагічнай практыкай студэнтаў у сельскіх і гарадскіх школах. Лекцыі Пятра Аляксеевіча заўсёды змястоўныя і цікавыя. Цудоўны прамоўца, ён удала выкарыстоўвае мастацкія сродкі ўздзеяння на слухачоў:

афарызмы, прыказкі, паданні, урыўкі з мастацкіх твораў. У яго арсенале вершы Пушкіна, Лермантава, Ясеніна, Коласа, Купалы, Броўкі, Гётэ, Байрана. Студэнты паважаюць П.А. Лярскага за высокую патрабавальнасць, якая спалучаецца з чуласцю, імкненнем зразумець кожнага.

За шматгадовую навукова-педагагічную дзейнасць Пётр Аляксеевіч атрымаў шэраг дзяржаўных узнагарод.

І сення юбіляр працягвае актыўна займацца навукова-даследчай дзейнасцю. Ім надрукаваны шэраг артыкулаў па пытаннях методыкі выкладання прыродазнаўства ў часопісах «Народная асвета», «Пачатковая школа». У бліжэйшы час плануецца выданне вучэбнага дапаможніка і кнігі па прыродзе Магілеўшчыны.

Пётр Аляксеевіч падтрымлівае цесныя сувязі з выкладчыкамі і студэнтамі нашага ўніверсітэта, удзельнічае ў рабоце навукова-практычных канферэнцый і семінарах.

Шчыра жадаем паважанаму нашаму калегу моцнага здароўя, творчага натхнення, далейшых поспехаў на ніве народнай асветы!

*Т.А. СТАРАВОЙТАВА*

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова